Беларускі дзяржаўны універсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
_______________ В.І. Чупрыс
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
_______________ 2018 г.
(дата зацвярджэння)
Рэгістрацыйны № УД-6243 /вуч.

# РАМАНТЫЗМ І РЭАЛІЗМ У СЛАВЯНСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ПАРАДЫГМЕ XIX СТ.

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**1-21-05-04 Славянская філалогія**

2018 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове АСВА 1-21 05 01–2013 і вучэбнага плана УВА D21-088/вуч. 2013 г. па спецыяльнасці 1 – 21 05 04 «Славянская філалогія».

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Дзюкава Э.Ю.**, дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай ______________ тэорыі літаратуры ________________
(назва кафедры)
(пратакол № 4 ад 31.10.2018 г.)

Саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 3 ад 29.11.2018 г.)

**ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ:**

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Т.А.Марозава

**Беларускі дзяржаўны універсітэт**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
_________________В.І.Чупрыс
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
__________________2018 г.
(дата зацвярджэння)

Рэгістрацыйны № УД – /вуч.

# РАМАНТЫЗМ І РЭАЛІЗМ У СЛАВЯНСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ ПАРАДЫГМЕ XIX СТ.

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**1-21-05-04 Славянская філалогія**

2018 г.

Вучэбная праграма УВА складзена на аснове АСВА 1-21 05 01–2013 і вучэбнага плана УВА D21-088/вуч. 2013 г. па спецыяльнасці 1 – 21 05 04 «Славянская філалогія».

**СКЛАДАЛЬНІК:**

**Дзюкава Э.Ю.**, дацэнт кафедры славянскіх літаратур, кандыдат філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Кафедрай тэорыі літаратуры
(назва кафедры)
(пратакол № 4 ад 31.10.2018 г.)

Саветам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 3 ад 29.11.2018 г.)

**ЗАГАДЧЫК КАФЕДРЫ:**

Кандыдат філалагічных навук,
дацэнт Т.А.Марозава

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна (спецкурс) “**Рамантызм і рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме XIX ст.**” прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 1 – 21 05 04 «Славянская філалогія». Дысцыпліна разлічаны на студэнтаў славянскага аддзялення філалагічнага факультэта БДУ і адрасаваны тым, хто вывучае славянскія мовы і літаратуры.

Матэрыял скампанаваны паводле храналогіі гісторыка-літаратурных эпох, зарыентаваны на грунтоўнае асэнсаванне і літаратурнага працэсу, і тэарэтыка-літаратуразнаўчых паняццяў. На аснове генетыка-тыпалагічнага прынцыпу прасочваюцца галоўныя этапы фарміравання асаблівасцей літаратурнага сумежжа Украіны, Беларусі, Польшчы.

Матерыял дысцыпліны **дэманструе сувязі**, з’яўляецца лагічным інтэграваным працягам тэм, якія асвятляюцца на лекцыях, семінарскіх, практычных занятках па наступных дысцыплінах: “Гісторыя літаратуры краіны вывучаемай мовы (украінская, польская)”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Літаратура бліжняга замежжа”, “Асновы літаратуразнаўчай славістыкі” і інш.

**Мэта** прапанаванай дысцыпліны – прадставіць панараму развіцця літаратуры рамантызму і рэалізму ў славянскіх народаў. Методыка падачы матэрыялу абумоўлена навукова-асветніцкімі і педагагічна-выхаваўчымі мэтамі ў самым шырокім аб’ёме: індывідуальна непаўторнае ў кожнай нацыянальнай літаратуры разглядаецца ў сістэмнай узаемасувязі з агульначалавечымі гуманістычнымі каштоўнасцямі.

**Задачы –** паглыбіць навуковы ўзровень мыслення студэнтаў, эстэтычны густ. Акрэсліць метадалагічныя асновы дысцыпліны, прааналізаваць нацыянальную літаратуру ў гістарычна-параўнальным плане з літаратурамі іншых народаў, найперш у кантэксце з культурамі народаў-суседзяў.

Спецкурс “Рамантызм і рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме XIX ст.” ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі цыкла дысцыплін спецыялізацыі.

У выніку вывучэння спецкурса «Рамантызм і рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме XIX ст.» **студэнты павінны ведаць:**

- шляхі развіцця еўрапейскага рамантызму і рэалізму; асаблівасці развіцця гэтых напрамкаў у славянскіх краінах;
- месца і ролю славянскага рамантызму і рэалізму на мастацкай арэне Еўропы;
- творчасць асноўных аўтараў, рамантыкаў і рэалістаў, ва ўкраінскай, беларускай і польскай літаратурах, творчыя кантакты і ўзаемадзеяння;
- спецыфіку беларускага, украінскага, польскага рамантызму і рэалізму; жанравыя і стылявыя асаблівасці.

**ўмець**:

- працаваць з арыгінальнымі тэкстамі і іх перакладамі на славянскія мовы;
- ажыццяўляць параўнальны аналіз асобных твораў, іх паэтыкі;
- знаходзіць доказы станаўлення рамантызму і рэалізму ў славянскіх літаратурах; выяўляць агульнае і асаблівае.

**валодаць:**

– навыкамі аналіза гістарычных і культурных падзей; найбольш значных літаратурных помнікаў;
– крытэрыямі, сістэмай ацэньвання ролі і значэння выдатных прадстаўнікоў, або падзей, якія стваралі літаратуру польскага, украінскага і беларускага народаў.

У выніку вывучэння спецкурса "**Рамантызм і рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме XIX ст.**"фарміруюцца наступныя акадэмічныя і прафесійныя кампетэнцыі:

***Акадэмічныя:***

**АК-8.** Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камінікацыі.

***Прафесійныя:***

**ПК-6.** Ажыццяўляць маніторынг адукацыйнага працэсу, дыягностыку навучальных і выхаваўчых вынікаў.

**ПК-7.** Планаваць. арганізоўваць і весці навукова-даследчую працу ў галіне філалогіі (тэксталогіі).

**ПК-11.** Прымяняць сучасную методыку рэферэравання і рэдагавання тэкстаў.

**ПК-12.** Карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай на беларускай, рускай і замежных мовах.

**ПК-22.** Вызначаць мэты інавацый і спосабы іх дасягненняў.

## Структура зместу вучэбнай дысцыпліны

На вывучэнне спецкурса **"**Рамантызм і рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме XIX ст.**"** студэнтам **3** курса філалагічнага факультэта спецыяльнасці "славянская філалогія" адводзіцца **50** гадзін. З іх **32** гадзіны аўдыторных заняткаў: **20** гадзін лекцыйных, **10** гадзін практычных заняткаў, **2** - кіруемай самастойнай работы.

Форма атрымання адукацыі – дзённая.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 2 заліковых адзінкі.

Форма выніковай атэстацыі – **залік у 6** сяместры.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

**Тэма 1. Рамантызм у славянскіх літаратурах.**

**1.1.** Рамантызм як літаратурная з’ява. Перыядызацыя. Асноўныя ідэі і асаблівасці паэтыкі. Новыя тэмы і новыя сродкі адлюстравання. Шляхі еўрапейскага рамантызму. Асаблівасці славянскага рамантызму.

**1.2.** Культурнае пасрэдніцтва паміж славянскімі народамі, ўзаемасувязі. “Украінская школа” рускага і польскага рамантызму.

**1.3.** Прафесійны тэатр славян у параўнальна-гістарычным асвятленні: рэцэпцыя – камунікацыя – традыцыя. Творчасць І. Катлярэўскага, А. Фрэдры, С. Манюшкі, В. Дуніна-Марцінкевіча. Украінскі кантэкст творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча.

**Тэма 2. Нацыянальная адметнасць польскага рамантызму.**

**2.1.** “Беларуская школа” польскіх рамантыкаў. Фальклор у эстэтычнай парадыгме польскіх рамантыкаў. Феномен літаратурнага сумежжа.Польскі рамантызм ў міжславянскіх сувязях і ўзаемадзеяннях.

**2.2.** Беларускі субстрат творчасці А. Міцкевіча.

**2.3.** Украіназнаўчае мысленне Ю. Славацкага.

**Тэма 3. Украінскі рамантызм. Асаблівасці. Перыядызацыя. Прадстаўнікі.**

**3.1.** Рамантызм Т. Шаўчэнкі. Гуманістычныя асновы хрысціянскага светапогляду, творчы метад пісьменніка. Т. Шаўчэнка і славянства.

**3.2.** Прыкметы рамантызму ў жанравым афармленні твораў. Сімволіка Шаўчэнкі. Сувязь з фальклорам. Галерэя жаночых вобразаў – яшчэ адзін доказ рамантызму. Культ мацярынства, апафеоз жаночага кахання і мукі.

**3.3** Тарас Шаўчэнка – сімвал беларускага нацыянальнага адраджэння.

**Тэма 4. Рэалізм у славянскіх літаратурах. Украінская і польская проза другой паловы XIX ст.: адметнасці польскага пазітывізму і ўкраінскага этнаграфічнага рэалізму.**

**4.1.** Рэалізм як мастацкі метад, мастацкая сістэма, тып мастацкага мыслення. Вытокі еўрапейскага рэалізму. Залежнасць рэалістычнага мастацтва ад навуковых прац у галіне прыродазнаўчых навук.

**4.2.** Пазітывізм. Галоўнае ў светапоглядзе пазітывістаў. Асноўныя прадстаўнікію.

**4.2.** Натуралізм у польскай літаратуры. Змрочная палітра замалёвак У. Рэйманта (1867 – 1925). Сусветная слава раманаў “Абяцаная зямля”, “Сяляне”. Карціны індустрыяльнага пекла і шырокая панарама жыцця вёскі. Людскія трагедыі і канфлікты, выкліканыя “ўладай зямлі”.

**4.4.** Побытава-этнаграфічны рэалізм украінскай прозы, яе моцная арыентацыя на адлюстраванне этнакультуры ўкраінцаў, апора на фальклорны матэрыял. Асноўныя прадстаўнікі.Творчасць І. Нечуя-Лявіцкага (1838 – 1918), П. Мірнага (1849 -1920).

**4.5.** Тэматычны дыяпазон, жанравая разнастайнасць і палітра “сакрэтаў” мастацкіх прыёмаў І. Франко.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТКА

| Нумар раздела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Семінарскія заняткі | Лабараторныя заняткі | Іншае | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1. | **Тэма 1. Рамантызм і славянскіх літаратурах**<br>**1.1.** Рамантызм як літаратурная з'ява. Перыядызацыя. Асноўныя ідэі і асаблівасці паэтыкі. Новыя тэмы і новыя сродкі адлюстравання. Шляхі еўрапейскага рамантызму. Асаблівасці славянскага рамантызму.<br>**1.2.** Культурнае пасрэдніцтва паміж славянскімі народамі, ўзаемасувязі. "Украінская школа" рускага і польскага рамантызму.<br>**1.3.** Прафесійны тэатр славян у параўнальна-гістарычным асвятленні: рэцэпцыя – камунікацыя – традыцыя. Станаўленне прафесійнага тэатру славянскіх народаў. Творчасць І. Катлярэўскага, А. Фрэдры, С. Манюшкі, В. Дуніна-Марцінкевіча. Украінскі кантэкст творчасці. | 2 | | | | | 2 | Пісьмовы тэст, рэфераты |
| 2. | **Тэма 2. Нацыянальная адметнасць польскага рамантызму.**<br>**2.1.** "Беларуская школа" польскіх рамантыкаў. | 4 | 2 | | | | | Вуснае апытанне |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Фальклор у эстэтычнай парадыгме польскіх рамантыкаў. Феномен літаратурнага сумежжа. Польскі рамантызм ў міжславянскіх сувязях і ўзаемадзеяннях.<br>**2.2.** Беларускі субстрат творчасці А. Міцкевіча.<br>**2.3.** Украіназнаўчае мысленне Ю. Славацкага. | | | | | | | |
| 3. | **Тэма 3. Украінскі рамантызм. Асаблівасці. Перыядызацыя. Прадстаўнікі.**<br>**3.2.** Рамантызм Т. Шаўчэнкі. Гуманістычныя асновы хрысціянскага светапогляду, творчы метад пісьменніка. Т. Шаўчэнка і славянства.<br>**3.3.** Прыкметы рамантызму ў жанравым афармленні твораў. Сімволіка Шаўчэнкі. Сувязь з фальклорам. Галерэя жаночых вобразаў – яшчэ адзін доказ рамантызму. Культ мацярынства, апафеоз жаночага кахання і мукі.<br>**3.4.** Тарас Шаўчэнка – сімвал беларускага нацыянальнага адраджэння. | 4 | 2 | | | | | Вуснае апытанне |
| 4. | **Тэма 4. Рэалізм у славянскіх літаратурах. Украінская і польская проза другой паловы XIX ст.**: адметнасці польскага пазітывізму і ўкраінскага этнаграфічнага рэалізму.<br>**4.1.** Рэалізм як мастацкі метад, мастацкая сістэма, тып мастацкага мыслення. Вытокі еўрапейскага рэалізму. Залежнасць рэалістычнага мастацтва ад навуковых прац у галіне прыродазнаўчых навук.<br>**4.2** Пазітывізм. Галоўнае ў светапоглядзе пазітывістаў. Асноўныя прадстаўнікі.<br>**4.3** Натуралізм у польскай літаратуры. Змрочная палітра замалёвак У. Рэйманта (1867 – 1925). Сусветная слава раманаў “Абяцаная зямля”, “Сяляне”. Карціны індустрыяльнага пекла і | 10 | 6 | | | | | Рэфераты |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | шырокая панарама жыцця вёскі. Людскія трагедыі і канфлікты, выкліканыя “ўладай зямлі”.<br>**4.4** Побытава-этнаграфічны рэалізм украінскай прозы, яе моцная арыентацыя на адлюстраванне этнакультуры ўкраінцаў, апора на фальклорны матэрыял.Асноўныя прадстаўнікі.Творчасць І. Нечуя-Лявіцкага (1838 – 1918), П. Мірнага (1849 -1920).<br>**4.5** Тэматычны дыяпазон, жанравая разнастайнасць і палітра “сакрэтаў” мастацкіх прыёмаў І. Франко. | | | | | | | |

## ИНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


1. Андреев, А. Н. Национальное как фактор художественности в литературе // Славянские литературы в контексте мировой / А. Н. Андреев. – Минск, 1995.
2. Ахрыменка, П. Тарас Шаўчэнка і Беларусь / П. Ахрыменка. – Мінск, 1969.
3. Бабосаў, Я. М. Шпенглер О. // Беларуская энцыклапедыя: ў 18 т. / гал. рэд. Пашкоў Г. П. – Мінск, 2003. - Т. 17.
4. Барабаш, Ю. «Коли забуду тебе, Єрусалиме…»: Гоголь і Шевченко. / Ю. Барабаш. – Харків, 2001.
5. Басс, І. І. Іван Франко / І. І. Басс, А. А. Каспрук. - Київ, 1983.
6. Білецький, Л. Основи української літературно-наукової критики / Л. Білецький. – Київ, 1998.
7. Брага, С. Міцькевіч і беларуская плынь польскае літаратуры / С. Брага. – Ню Ёрк, 1957.
8. Будний, В. Порівняльне літературознавство / В. Будний, М. Ільницький. – Київ, 2008.
9. Возняк, М. С. Історія української літератури: в 2 кн. / М. С. Возняк. - Львів, 1992, 1994. - Кн. 1, 2.
10. Гісторыя славянскіх літаратур і праблемы іх параўнальнага вывучэння: тэорыя і практыка: вучэб. дапам. / склад. П.І. Навойчык; пад агул. рэд. Т.В. Кабржыцкай, М.М. Хмяльніцкага. – Мінск: БДУ, 2015. – 207 с.
11. Голубенко, П. Україна і Росія у світлі культурних взаємин / П. Голубенко. – Київ, 1993.
12. Гончар, О. І. Українська література передшевченківського періоду і фольклор / О. І. Гончар. - Київ, 1982.
13. Горский, И. К. К вопросу о белорусско-польских литературных связях / И. К. Горский // Советское славяноведение. – 1967. - № 3. – С. 30-35.
14. Грабович, Г. Шевченко, якого не знаємо / Г. Грабович. - Київ, 2000.
15. Гром’як, Р. Історія українськой літературної критики: від початків і до кінця XIX ст. / Р. Гром’як. – Тернопіль, 1999.
16. Грушевський, М. С. Історія української літератури: в 6 кн., 9 т. / М. С. Грушевський. – Київ, 1993 - 1996.
17. Дзюкава Э. Аляксей Ярэмчанка: з гісторыі ўкраінскамоўных перакладаў твораў Максіма Багдановіча / Максім Багдановіч: дыялог з часам (асоба пісьменніка і яго творчасць у сусветным дыскурсе XX – XXI стст.) // Матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. – Мінск: РІВШ, 2017. – С. 31-36.

18. Дюришин, Д. Теория сравнительного изучения литературы / Д. Дюришин. - М., 1979.
19. Забужко, О. Шевченків міф України / О. Забужко. - Київ, 1997.
20. Історія українськой літератури кінця XIX – початку XX ст. / за ред. Н. Й. Жук, В. М. Лесина. – Київ, 1989.
21. Історія української літератури XIX ст.: у 2 кн. / за ред. М. Жулинського.– Київ, 2006. - Кн. 2.
22. Кабржыцкая, Т. В. Украінская літаратура: вучэб. дапам. хрэст.: у 5 ч. / Т. В. Кабржыцкая, П. І. Навойчык, У. В. Рагойша. – Мінск, 2004, 2005. – Ч. 1, 2.
23. Кабржыцкая, Т. В. Гісторыя ўкраінскай літаратуры. Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі: у 2-х ч. Ч. 1 / Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі, Э. Ю. Дзюкава. – Мінск, 2012.
24. Калениченко, Н. Українська література XIX ст.: напрями, течії / Н. Калениченко. - Київ, 1977.
25. Касперський, Е. Про теорію компаративістики. Література. Теорія. Методологія / Е. Касперський // упоряд. і навук ред. Данути Уліцької. – Київ, 2006.
26. Комаринець, Т. Ідейно-естетичні основи українського романтизму: проблема національного й інтернаціонального / Т. Комаринець. – Львів, 1983.
27. Кононенко, П. Українська література: проблеми розвитку / П. Кононенко. – Київ, 1994.
28. Литературные связи славянских народов. – Ленинград, 1988.
29. Мархель, У. Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. / У. Мархель. – Мінск, 1991.
30. Наєнко, М. Українське літературознавства: школи, напрями, тенденції / М. Наєнко. – Київ, 1997.
31. Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей: Культурна-гістарычны і літаратурны аспекты праблемы. – Мінск, 2002.
32. Павличко, Д. Український патріотизм Юліуша Словацького / Д. Павличко // Словацький Юліуш. Срібний міф України: поезії, поеми, драми. – Львів, 2005.
33. Приходько, П. Г. Шевченко й український романтизм 30-50-х років XIX ст. / П. Г. Приходько. – Київ, 1963.
34. Пяткевіч, А. Рэгіянальныя асаблівасці польскай літаратуры XIX ст. у Беларусі / А. Пяткевіч // Польская мова і літаратура ў кантэксце славянскіх культур. – Гродна, 1995. – С. 33-37.
35. Украінская літаратура: хрэстаматыя: у 5 ч. // аўтары-склад. Т. В. Кабржыцкая, П. І. Навойчык, У. В. Рагойша. – Мінск, 2004, 2005. – Ч. 1, 2.

36. Феномен пагранічча: польская, украінская і беларуская літаратура – уплывы і ўзаемаўзбагачэнне: зб. арт. пад рэд. С. Кавалёва і І. Набытовіча. - Мінск, 2008.
37. Хаўстовіч, М. Шляхамі да беларускасці: нарысы, артыкулы, эсэ / М. Хаўстовіч. – Warszawa, 2010.
38. Чарота, І. А. Да праблемы тыпалогіі рамантызму ў славянскіх літаратурах / І. А. Чарота // Славянскія літаратуры: праблемы развіцця: зб. арт. пад рэд. І. А. Чароты – Мінск, 2003.
39. Чижевський, Д. І. Історія української літератури / Д. І. Чижевський. – Київ, 2003.
40. Штэйнер, І. Балада: генезіс, эвалюцыя, перспектывы жанру / І. Штэйнер. – Мінск, 2003.
41. Яценко, М. Т. Питання реалізму і позитивний герой в українській літературно-естетичній думці першої половини XIX ст. / М. Т. Яценко. – Київ, 1979.
42. Białokozowicz, B. Marian Zdziechowski i Lew Tołstoj / B. Białokozowicz. – Białystok, 1995.
43. Biografia – Geografia – Kultura Literacka / red. M. Straszewska. – Warszawa, 1975.
44. Dziesięć wieków związków wschodniej słqwiańszczyzny z kulturą Zachodu. – Lublin, 1990.
45. Jakóbiec-Semkowa, M. Słowiańska pieśń ludowa w polskich przekładach doby romantyzmu / M. Jakóbiec-Semkowa. – Wrocław, 1991.
46. Jarzębski, J. W Polsce czyli wszędzie. Szkice o polskiej prozie współczesnej / J Jarzębski. – Warszawa, 1992.
47. Jaskólowa, E. Literatura polska: od Bogurodzicy do poezji Szymborskiej / E. Jaskólowa. – Chicago – Warszawa, 2001.
48. Janion, M. «Szkoła białoruska» w poezji polskiej / M. Janion // Przegląd Wschodni. – Warszawa, 1969. – S. 32-35.
49. Rudziewicz, I. Problematyka słowiańska na łamach pisma «Rusałka» (1838–1842) / I. Rudziewicz. – Acta Polono-Puthenika, 1996. - № 1.
50. Uliasz, S. Literatura kresów – kresy literatury / S. Uliasz. – Rzeszów, 1994.
51. Wyka, K. Czy byliśmy romantykami? / K. Wyka // Pogranicze powieści. – Warszawa, 1974. – S. 351-383.
52. Witkowska, A. Litewsko-białoruska przestrzeń idylliczna / A. Witkowska // Przegląd wschodni. – 1991. – T. I.– S. 49-58.
53. Zanewska, T. A dusza jest na wschodzie: Polsko-białoruskie związki literackie / T. Zanewska. - Białystok, 1993.
54. Z domu niewoli. Sytuacja polityczna a kultura literacka w drugiej połowie XIX w. - Warszawa, 1998.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДА КСР

1. Перыядызацыя еўрапейскага и славянскага рамантызму.
2. Новыя тэмы і новыя сродкі адлюстраванія рэчаіснасці ў творчасці рамантыкаў.
3. Рамантызм ў культуры славянскіх народаў. Нацыянальныя адметнасці.
4. Роля польскамоўных перыядычных выданняў ў асвятленні пытанняў духоўнай культуры ўкраінцаў, беларусаў, рускіх і палякаў.
5. «Украінская школа» рускага рамантызму.
6. «Украінская школа» польскага рамантызму.
7. Украінскі кантэкст біяграфіі і творчасці пачынальніка беларускай драматургіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
8. З'яўленне ва ўкраінскай літаратуры велічнага нацыянальнага эпасу.
9. Іван Франко – літаратуразнаўца-кампарытывіст, паліглот, даследчык і папулярызатар польскай літаратуры.
10. Феномен беларуска-польска-ўкраінскага літаратурнага сумежжа.

## Прыкладная тэматыка практычных заняткаў
## па вучэбнай дысцыпліне

**Тэма : Украінская проза другой паловы XIX ст.: адметнасці ўкраінскага этнаграфічнага рэалізму.**

1. Украінскі рэалізм у славянскай літаратурнай парадыгме. Перыядызацыя. Нацыянальныя адметнасці.
2. Творчасць І. Нечуя-Левіцкага.

1) Сацыяльна-побытавы бок рэчаіснасці. Паэтызацыя ўкладу жыцця і ўкраінскай прыроды (“Мікола Джэра”, “Сям'я Кайдаша”, “Старасвецкія бацюшкі і матушкі”, “Чортава спакуса”, “Галоднаму і апенькі як мяса” і інш.).
2) Гістарычная проза (“Князь Іерэмія Вышнявецкі”. “Гетман Іван Выгоўскі”)
3) Тэма “Хаджэння ў народ” (“Хмары, “Над Чорным морам” і інш.)

3. Рэалістычна-псіхалагічная проза П. Мірнага. Раман “Гуляшчая”.
4. Рэалізм І. Франко.

## Літаратура:


1. Історія української літератури кінця XIX – початку XX ст. / за ред. Н. Й. Жук, В. М. Лесина. – Київ, 1989.
2. Історія української літератури XIX ст.: у 2 кн. / за ред. М. Жулинського.– Київ, 2006. - Кн. 2

3. Кабржыцкая, Т. В. Гісторыя ўкраінскай літаратуры. Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі: у 2-х ч. Ч. 1 / Т. В. Кабржыцкая, М. М. Хмяльніцкі, Э. Ю. Дзюкава. – Мінск, 2012.
4. Калениченко, Н. Українська література XIX ст.: напрями, течії / Н. Калениченко. - Київ, 1977.
5. Феномен пагранічча: польская, украінская і беларуская літаратура – уплывы і ўзаемаўзбагачэнне: зб. арт. пад рэд. С. Кавалёва і І. Набытовіча. - Мінск, 2008.
6. Чижевський, Д. І. Історія української літератури / Д. І. Чижевський. – Київ, 2003.
7. Яценко, М. Т. Питання реалізму і позитивний герой в українській літературно-естетичній думці першої половини XIX ст. / М. Т. Яценко. – Київ, 1979.

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Змест і формы самастойнай работы студэнтаў распрацоўваюцца, выбіраюцца і адаптуюцца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі спецыялістаў.

Магчымымі формамі арганізацыі самастойнай кіруемай работы студэнтаў з'яўляюцца:

- праблемна-арыентаваны аналіз тэм, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі;
- індывідуальныя кансультацыі з выкладчыкам;
- выкананне прамежкавых тэстаў;
- вывучэнне і канспектаванне хрэстаматый і зборнікаў;
- праца са слоўнікавай і слоўнікава-энцыклапедычнай літаратурай;
- вядзенне запісаў у дзённіку чытача;
- складанне паняційна-тэрміналагічнага слоўніка (гласарыя) па вучэбнай тэме;
- пастаноўка кантрольных пытанняў па тэме;
- падбор картатэкі прыкладаў аналізуемых з'яў;
- падрыхтоўка адказаў і паведамленняў;
- выкананне кантрольных работ;
- пошукавая работа ў даведачна-бібліяграфічным аддзеле бібліятэкі, архіве, музее;
- складанне бібліяграфіі па дадзенай тэме;
- анацыраванне друкаваных і электронных крыніц (асобных раздзелаў кніг; артыкулаў, публікацый у прадметнай перыёдыцы);
- складанне разгорнутых планаў і тэзісаў навуковых крыніц (у тым ліку вядзенне запісаў цытатнага характару);
- рэферыраванне альбо канспектаванне навуковых артыкулаў, асобных раздзелаў навуковых крыніц (напрыклад, манаграфій), фармуліраванне іх рэзюмэ;
- напісанне аналітыка-ацэначных тэкстаў (каментарыяў, водгукаў, рэцэнзій) па прачытаным крыніцам;
- распрацоўка візуальных матэрыялаў па вывучаных тэмах, включаючы стварэнне мультымедыйных прэзентацый;
- напісанне тэматычных дакладаў і эсэ, дыскусійных разважанняў на праблемныя тэмы;
- выкананне розных творчых і даследчых заданняў;
- падрыхтоўка да конкурсаў і канферэнцый.

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытванне падчас заняткаў;
- пісьмовыя кантрольныя работы;

- пісьмовыя работы (пераклады, пераказы, сачыненні, эсэ, рэцэнзіі, анатацыі);
- адзнака па практычных занятках;
- выніковае тэсціраванне;
- выніковыя формы атэстацыі (залік).

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ІНАВАЦЫЙНЫХ ПАДЫХОДАЎ ДА ВЫКЛАДАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Метады інавацыйнага навучання:

- метад праблемнай нагляднасці;
- метад літаратуразнаўчай алюзіі;
- метад актывізацыі асацыятыўных сувязей і інш.

Прыёмы работы на аўдыторных занятках:

- асацыятыўны;
- прыём складання тэматычнай сеткі,
- прыёмы складання схем,
- літаратуразнаўчая дыскусія, дыспут і інш.

Матэрыяльна-дыдактычны бок інавацыйных тэхналогій звязаны з новай функцыяй літаратуразнаўчай нагляднасці, якая забяспечвае кіраванне пазнаваўчай дзейнасцю студэнтаў праз апарат эмоцый.

## ПАТРАБАВАННІ ДА СТУДЭНТАЎ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Ацэнка ведаў студэнтаў на працягу семестра (вучэбнага года) праводзіцца ў адпаведнасці з пастановай МА № 53 ад 29.05.2012 г. і складаецца:

- з вынікаў работы на практычных занятках (ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай);
- выканання кіруемай самастойнай работы (ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай);
- выканання пісьмовых работ (ацэньваюцца ў балах адпаведна з рэйтынгавай карткай).

Этапы засваення зместу вучэбнага матэрыялу фіксуюцца ў рэйтынгавай картцы.

## МЕТОДЫКА ФАРМАВАННЯ ВЫНІКОВАЙ АДЗНАКІ

Выніковая адзнака фармуецца на аснове:

1. Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў (Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь № 53 ад 29 мая 2012 г.);
2. Палажэння аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў БДУ (Загад рэктара БДУ ад 18.08.2015 г. №382-ОД);
3. Крытэрыяў ацэнкі ведаў студэнтаў (ліст Міністэрства адукацыі ад 22.12.2003г.)

**ПРАТАКОЛ**
**УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ**

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы по вучэбной дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя польскай літаратуры | кафедра тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта | прапаноў няма | Змяненняў не патрабуецца пратакол № 9 ад 22.06.2018 |
| Гісторыя ўкраінскай літаратуры | кафедра тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта | прапаноў няма | Змяненняў не патрабуецца пратакол № 9 ад 22.06.2018 |

**ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ**
**Ў ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЕ УВА**
**НА _________ / _________ ВУЧЭБНЫ ГОД**

| № п/п | Дапаўненні і змены | Абгрунтаванне |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
________________________________ (пратакол № ____ ад __________ 20___ г.)

Загадчык кафедры

_____________________ ___________________ _______________________

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта

_____________________ ___________________ _______________________